нагэтулькі прываблівай ілюзорнасці, што зыходзіць ад знешняй прастаты беларускага адраджэння, змагчы накіраваць свае сілы на дасягненне няхай сабе і складанага, але арганічна ўласцівага духу нашага народа ідэалу.

Сказанае вышэй толькі пачатак, бледнае набліжэнне да ўсведамлення сваёй нацыянальнай ідэі, рух да сапраўднай нацыянальнай самасвядомасці — свядомасці народа, які разумее і рэалізоўвае тое, што прызначана яму спадаром Лёсам і чаго чакае ад яго ягоная ж духоўная сутнасць.

**Пілевіч Г.М.,**
*суіскальнік кафедры*
*культуралогіі і сацыялогіі*

## У ЧЫМ ТВАЯ ВЕРА?

Не будзе адкрыццём, калі скажам, што літаральна за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў прыкметна змяніліся, калі так можна сказаць, адносіны паміж чалавекам і мастацтвам. Гэтаксама, як, між іншым, змяніліся адносіны між тымі, хто стварае мастацтва, і яго аматарамі, "спажыўцамі". Жыццё сведчыць: з кожным годам, асабліва з пачаткам так званай перабудовы, "творы" масавай сурагатнай культуры, нягледзячы на пратэсты свядомай грамадскасці, усё больш і больш запаланяюць кіна- і тэлеэкраны, кнігарні, абвальваюцца на старонкі перыядычных выданняў. Не сакрэт таксама, што такія "творы", накіраваныя на разбурэнне чалавечага духу і традыцыйнай чалавечай маралі, узбагачаюць, і даволі моцна, як іх аўтараў, так і розных камерсантаў, гандляроў і г.д.

Як вядома, у многіх краінах, на дзяржаўным узроўні падтрымліваецца сапраўдная культура, і, як кажуць, там маральнасць насельніцтва на даволі высокім

узроўні. А ў нас? Тэлебачанне, напрыклад (у першую чаргу маюцца на ўвазе расійскія тэлеканалы, якія вяшчаюць і на нас), мабыць, выконваючы нечыя заказы, з дня ў дзень упарта, мэтанакіравана навязвае нам заганныя, чужыя маральныя і духоўныя вартасці, якія, скажам так, культывіруюць у чалавечым асяродку прагу нажывы, прыярытэт грошай перад іншымі, сапраўднымі агульначалавечымі каштоўнасцямі, заадно паказваючы насілле і кроў.

Назіральнікі, навукоўцы, сацыёлагі, аналітыкі сцвярджаюць, напрыклад, што пэўныя аспекты дэградацыі закранулі і Беларусь. Рэфармацыйныя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне ў сённяшніх складаных эканамічных і грамадска-палітычных умовах, выявілі рэзкае размежаванне сярод розных слаёў насельніцтва, абвастрылі многія крызісныя з'явы ў нашым жыцці. Як мы ведаем, расце ўзровень злачыннасці, паўсюль ідзе ў наступ бездухоўнасць, пераглядаюцца сапраўдныя маральныя каштоўнасці, ганьбуюцца такія паняцці, як дабрыня, чалавечнасць і інш.

Думаецца, што дзяржава дарэмна даволі прыкметна самаўхілілася ад рэгулявання ўсяго гэтага. Верыцца, што ў хуткім часе яна ўсё ж вернецца да неабходнага кантролю ва ўсіх сферах дзейнасці, звязаных з выхаваннем людзей у сапраўдным духу дабрыні і чалавечнасці, як след зоймецца функцыямі абароны чалавека ад усяго заганнага ў так званай культурнай прасторы. Гэта ўсё вельмі важна найперш у выхаванні падрастаючага пакалення — будучыні краіны.

Сёння таксама можна гаварыць аб тым, што трэба адпаведная каардынацыя выхаваўчых працэсаў у сістэме адукацыі. Здаецца, яшчэ нядаўна наша адукацыйная сістэма ў многім сапраўды была шмат чаго вартая ўвогуле ў працэсе выхавання падрастаючага пакалення. Зараз складваецца ўражанне, што ў нас ніхто як след не заклапочаны гэтым. Незразумела, якая сістэма арганізацыі

кантролю за выхаваўчымі працэсамі дзейнічае ў грамадстве. Хаця відавочны энтузіязм асобных педагогаў, але ж ён часта не падмацаваны навуковымі абгрунтаваннямі. Старая сістэма этычных ведаў у многім сябе вычарпала хаця б таму, што абапіралася ў асноўным толькі на знешнія сілы рэгулявання маральных аспектаў чалавечых паводзін (парткам, прафкам, працоўны калектыў).

Што б ні казалі, але як толькі мы пазбавіліся ад іх апекі, так і пачало разрастацца ўсё негатыўнае. (Выходзіць, што самі людзі не былі падрыхтаваны да той унутранай і сацыяльнай свабоды, якую атрымалі.) Зрэшты, можа, гэта наша агульная бяда — быць непадрыхтаванымі да самастойных дзеянняў ва ўсіх сферах жыцця. Уражанне такое, што сёння нам не хапае культуры, не толькі агульнай, але і палітычнай. Вядома, калі ёсць вакуум, калі не хапае сапраўднай культуры, дык яе месца займаюць розныя падробкі, у тым ліку і тыя, якія нясуць у сабе разбуральны зарад. З гэтым нельга не лічыцца.

Сёння мы, можа, як ніколі пачынаем разумець, што грамадству нельга абмяжоўвацца толькі нейкімі эканамічнымі паказчыкамі, што разумна будзе суадносіць іх з маральнымі. Тут, здаецца, адзінай надзейнай абаронай ад амаральнасці грамадства могуць быць трывалыя нацыянальна-этычныя традыцыі і ўстаноўкі жыцця народа.

У нас, напрыклад, яны вельмі моцна выяўлены ў беларускай літаратуры, якая ва ўсе часы была сапраўды гуманістычнай; яна вучыла і вучыць чалавекалюбству, сцвярджае жыццё. І вельмі шкада, што ў апошнія гады кнігі беларускіх аўтараў чамусьці знікаюць з паліц кнігарняў, а іх месца нахабна займаюць заганныя, без перабольшвання шкодныя для чалавечага духу ўсялякія замежныя, а часам і ў нас напісаныя падробкі пад яе. Культура нашага народа адметная, і мы ні ў якім разе не павінны дазваляць, каб яна знішчалася.

Хочацца падкрэсліць, што нельга рэфармаваць грамадства, грэбуючы нацыянальнымі здабыткамі ў галіне культуры і літаратуры, не звяртаючы ўвагі на тыя набыткі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў гэтых сферах, якія напрацаваны стагоддзямі. Пагодзімся: калі народ не мае магчымасці арыентавацца на ўсё лепшае, напрацаванае папярэднікамі, дык ён становіцца бяспамятным, гістарычна неадукаваным і наогул трапляе ў тупіковую сітуацыю, дзе сапраўдныя духоўныя каштоўнасці падмяняюцца псеўдакаштоўнасцямі. Сёння гэта добра бачна. Растуць злачыннасць, наркаманія, прастытуцыя і г.д. Тут вось яшчэ на што варта звярнуць увагу. Праект перабудовы падзяляе свет на развіты і неразвіты, садзейнічае эгаізму развітых краін і знішчэнню традыцыйнай нацыянальнай культуры. Вось ужо сапраўды да месца выраз: якая культура, такое і грамадства. А ў нашым грамадстве? Культуру выкарыстоўваюць ужо не для духоўнага ўдасканалення, а для камерцыйных і вульгарных мэт.

Жахліва, што такім чынам у свядомасць людзей паступова ўкараняюцца прымітывізм, агрэсіўныя адносіны да мінулага свайго народа, што сапраўдныя духоўныя каштоўнасці падмяняюцца ўяўнымі. Паступова разбураецца вера ў самога чалавека. А што ўзамен? А ўзамен — амерыканізацыя нацыянальнай культуры, фарміраванне так званай рыначнай асобы з яе здольнасцю быць тым, на што ёсць попыт. Нам здаецца, што гэта ўсё яшчэ не ўсвядомлена грамадствам як след, а можа, часам і свядома на ўсё гэта не звяртаюць увагі незычліўцы беларускай, ды і рускай культуры.

Няма неабходнасці даказваць, што любы народ, любая нацыя могуць існаваць і развівацца толькі тады, калі яны захоўваюць свае нацыянальна-культурныя асаблівасці, калі, узаемадзейнічаючы з іншымі народамі і нацыямі, абменьваючыся з імі культурнымі каштоўнасцямі, не трацяць адметнасці сваёй культуры. Так што маюць рацыю тыя, хто сцвярджаюць: наша культура мае патрэбу ў абароне. Так, яе камерцыялізацыя нясе пагрозу духоўнаму багаццю народа. Зрэшты, людзі старэйшых пакаленняў, якія шмат пабачылі на сваім вяку, шмат чаго перажылі, але змаглі пранесці праз усе нягоды чысціню душы, вядома ж, і на гэты раз выстаяць. А вось моладзь...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сапраўды, што рабіць у дадзенай сітуацыі дзецям, падлеткам, ды і юнакам, псіхіка і светапогляд якіх вельмі падатлівыя і фарміруюцца якраз пад уздзеяннем ужо згаданых “твораў”?

Многія даследчыкі сцвярджаюць, што духоўнае спусташэнне ў новым пакаленні ўжо набліжаецца да той мяжы, за якой разбураюцца ўсе маральныя бар’еры. Паводзіны чалавека вызначаюць, з аднаго боку, яго розум і псіхіка, з другога — інфармацыя,якую ён атрымлівае.

Новыя паведамленні аналізуюцца на аснове здаровага сэнсу, супастаўляюцца з уласнымі ўяўленнямі пра свет. Чалавек прымае рашэнне, робіць выбар, здзяйсняе ўчынак.

Так дзейнічае чалавек разумны, у якога сфарміраваліся псіхіка, светапогляд. А што рабіць дзіцяці, падлетку, псіхіка якіх фарміруецца ў залежнасці ад той інфармацыі і вобразаў, якія на іх абвальваюцца?

У дзіцяці ва ўсе часы былі “ахоўныя абалонкі”. Бацькі і выхавацелі акружалі яго ўвагай і выконвалі ролю своеасаблівых цэнзараў, абмяжоўвалі доступ інфармацыі, якая магла прынесці шкоду. Таму любую сферу чалавечай дзейнасці неабходна разглядаць праз прызму маральнай дасканаласці асобы.

Калі мы забываемся на гэта, то маем рэальныя ідэалагічныя страты ва ўсіх сферах жыцця.

Псіхолагі, якія працуюць з падлеткамі, сцвярджаюць, што парушэнне маральных асноў прыводзіць іх да псіхозаў і неўрозаў. А гэта пагроза будучыні грамадства, ад гэтага залежыць здароўе нацыі.

Любая хвароба дзіцяці — гора для бацькоў, для яго самога. Тым больш псіхічная. Вядома, з ёй цяжка змагацца, калі ў грамадстве будуць захоўвацца абставіны, якія правакуюць яе. Доўгатэрміновы неўроз папярэднічае затрымцы псіхічнага развіцця.

Ёсць звесткі абследавання дзяцей у рэспубліцы, ды і на тэрыторыі ўсяго былога СССР, якія сведчаць, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасць хлопчыкаў і дзяўчынак, якія пакутуюць на неўроз, перавышае ўсе дапушчальныя нормы. Мала таго, трэба казаць і пра тое, што норма ўжо становіцца выключэннем. Калі ў так званыя дaперабудовачныя часы дзіцячы садок можна было разглядаць як мадэль, якую ўлады навязвалі грамадству, то зараз пра гэта і казаць нельга. Чуюцца нават сцвярджэнні і, мабыць, не без падстаў, што сёння нацыя затрымліваецца ў сваім унутраным, псіхалагічным развіцці. Можна таксама сцвярджаць, што нашых дзяцей "крадуць" нашы незычліўцы праз сродкі масавай інфармацыі, асабліва расійскія. Дзякуй богу, дзяржаўныя беларускія ў сваёй большасці (факт агульнапрызнаны) усё яшчэ не дазваляюць сабе прапагандаваць секс, насілле, забойства і да т.п.

Думаем, ніхто не будзе пярэчыць, што гады так званай перабудовы адзначаны нечуваным і нябачаным дасюль струменем усяго антыгуманнага, антычалавечага.

Сёння ўжо можна гаварыць, што набліжаюцца агульныя заняпад і разбурэнне той духоўнай культуры, тых агульначалавечых каштоўнасцей, якія раней сапраўды нас вызначалі. І ўсё ж верыцца: грамадства своечасова зразумее, што без добрай, чалавекалюбнай кнігі, карціны яму не абысціся, сапраўднае мастацтва зноў будзе запатрабавана; вось толькі шкада, калі гэта будзе недаравальна позна.

Вядома, бацькам, школе вельмі цяжка абараніць дзяцей як след ад спакус. Вядома таксама, што ад таго, якім будзе маральнае здароўе ў нашых дзяцей, якія маральныя прынцыпы яны прымуць у пару свайго станаўлення, у значнай меры залежыць будучыня народа, краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ